Нікуліна, Л. Гісторыя Барані ў датах / Л. Нікуліна // Аршанская газета. – 2023. – 15 лютага. – С. 15.

## ГІСТОРЫЯ БАРАНІ Ў ДАТАХ


Палац культуры, 1968 год
Палац культуры г. Барані ў наш час

**Барань – маленькі горад у Віцебскай вобласці, які знаходзіцца ўсяго за восем кіламетраў ад райцэнтра Оршы. Горад размясціўся на рацэ Адроў, на правым прытоку Дняпра. Сёлета яму спаўняецца 505 гадоў.**

Па адной з легенд горад заснаваў князь Радзівіл, які праязджаў па гэтых землях і сустрэў пастуха з атарай. Магнату так спадабаліся мясцовыя краявіды, што ён загадаў закласці тут мястэчка. Тым не менш, першае пісьмовае згадванне аб Барані як аб невялікім селішчы, у якім пражывалі рамеснікі і гандляры, якое належала князям Астрожскім, датуецца 1518 г.

У 1597 г. маршал Вялікага Княства Літоўскага Канстанцін Астрожскі заснаваў тут «кулявы двор» – вялікую металургічную майстэрню, дзе з балотных руд плавілі жалеза і выраблялі ядры і кулі для гармат і гарматных ядраў. У гэтым жа годзе сяло Барань стала цэнтрам воласці і ўвайшло ў склад Аршанскага павета Віцебскага ваяводства. З 1598 г. сяло ўваходзіла ва ўладанні гетмана Вялікага Княства Літоўскага князя Крыштофа Радзівіла і з 30 кастрычніка 1598 г. стала называцца мястэчкам паводле падараванай князем грамаце.


Прыходская Праабражэнская царква ў Барані, 1970-я г.
Храм Праабражэння Гасподняга

Нягледзячы на тое што непадалёк праходзіў важны гандлёвы шлях, развіццю горада перашкаджалі шматлікія войны. У выніку 1-га падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. паселішча ўвайшло ў склад Расійскай імперыі, дзе стала цэнтрам Аршанскага павета. У гады Айчыннай вайны (1812 г.) тут спыняўся падчас паходу рускі генерал Вітгенштэйн.

У 1862 г. была ўтворана Баранская воласць Аршанскага павета Магілёўскай губерні. А ў 1872 г. у маёнтку Барань быў заснаваны крухмальны завод, далей у 1873 г. прадпрымальнікам дваранінам Ігнатам Менжынскім заснавана драцяна-цвіковая вытворчасць. У гэты час прадукцыя завода выстаўлялася на знакамітым Ніжагародскім кірмашы і прадавалася па ўсёй Расіі. У 1914–1917 гг. завод выконваў ваенныя замовы расійскай арміі і франтоў першай Сусветнай вайны. У далейшым ён бесперапынна нарошчваў вытворчасць металавырабаў і да пачатку XX стагоддзя з'яўляўся адным з найбуйнейшых металаапрацоўчых прадпрыемстваў Беларусі. З 1924 г. Барань стала часткай БССР, атрымаўшы статус цэнтра сельскага савета. З прыходам савецкай улады і правядзеннем палітыкі нацыяналізацыі завод стаў называцца «Чырвоны Кастрычнік», а ў 1991 г. памяняў сваю назву і пераўтварыўся ў аграрна-прамысловае прадпрыемства «Лёс», якое разам з вытворчасцю цвікоў займала вельмі значную ўдзельную вагу ў саюзнай вытворчасці ўсіх відаў тэкса, шпілек, дроту для абутковай прамысловасці. У савецкі час завод вырабляў радыёстанцыі для дарожнага транспарту, выпускаў радыётэхнічную прадукцыю для ваенных і грамадзянскіх патрэб, таксама варта адзначыць, што завод з'яўляўся пастаўшчыком сродкаў сувязі для Алімпійскіх гульняў 1980 г. у Маскве, будаўніцтва БАМа, для работ па ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі і інш. З 2011 г. і да гэтага часу прадпрыемства называецца ААТ «Тэхніка сувязі». У гэтым годзе яно будзе святкаваць свой 150-гадовы юбілей.

У 1935 г. Барані афіцыйна надаецца статус працоўнага пасёлка.

У 1941 г. пасёлак быў акупіраваны нямецкімі войскамі. Пасля вызвалення тэрыторыі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Барань уваходзіла ў склад Баранскага сельскага савета. У 1944 г. у пасёлку быў разгорнуты ўрачэбна-амбулаторны ўчастак і дзіцячыя яслі на заводзе. Пасля вайны дзейнічалі вадзяны млын, беларуская сярэдняя школа, школа фабрычна-заводскага навучання № 72 (у далейшым рэарганізаваная ў вучылішча № 22 металістаў, па спецыяльнасцях токар, электраманцёр, слесар, сталяр-чырванадрэўшчык. Таксама ў пасляваенны перыяд дзейнічалі завод «Чырвоны Кастрычнік», арцель «Калектыўная праца» да 1948 г, калгас «Чырвоны Кастрычнік» да чэрвеня 1950 г.

У кастрычніку 1947 г. на тэрыторыі пасёлка быў утвораны Баранскі пасялковы савет дэпутатаў працоўных. У 1951 г. у Барані была адкрыта хата-чытальня, у якой налічвалася 2 826 кніг і 520 чытачоў. З сярэдзіны 50-х гадоў актыўна вядзецца індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва і праводзяцца работы па добраўпарадкаванні пасёлка, кантроль за паляпшэннем медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Актыўна праводзіліся работы Аршанскім гарадскім аддзелам адукацыі па барацьбе з непісьменнасцю насельніцтва ва ўзросце ад 16 да 49 гадоў.

У верасні 1960 г. у склад пасялковага савета ўвайшлі вёскі Барань, Белева-1, Белева-2, Балбасава, Бранцава, Белая Ферма, Галачова, Клюшнікава, Навасёлкі, Пустынкі, Татарск, Целянцеева, Хімінічы, Чэрвіна. У студзені 1963 г. усе гэтыя населеныя пункты былі перададзены ў склад новастворанага Першамайскага сельскага савета, у складзе ж Баранскага пасялковага савета застаўся толькі працоўны пасёлак Барань. У студзені гэтага ж года Баранскі пасялковы савет быў пераведзены ў адміністрацыйнае падпарадкаванне Аршанскай гарадской Рады дэпутатаў працоўных, у сувязі з гэтым сярэдняй школе пасёлка быў прысвоены № 15 (бо ў Оршы ў гэты час было 14 школ!), а школе працоўнай моладзі быў прысвоены № 5.

Прымалі актыўны ўдзел у культурнай асвеце насельніцтва работнікі Палаца культуры «Чырвоны Кастрычнік», дзе праводзіліся дэкады рускага мастацтва з аўтарскімі канцэртамі, дэкады тэатральнага мастацтва. Цяпер ён называецца дзяржаўная ўстанова культуры «Палац культуры г. Барань».

У 1967 г. у Барані былі пабудаваны комплексная спартыўная пляцоўка і басейн завода. У 1970 г. у Барані з'явілася новая форма працы з насельніцтвам – агітпляцоўка. У летні перыяд у парку выступалі кіраўнікі пасёлка і завода, калектывы мастацкай самадзейнасці.

Нягледзячы на сваю шматвяковую гісторыю, статус горада Барань атрымала толькі ў 1972 г. У 1975 г. была пабудавана сярэдняя школа № 18, а ў 1977 г. – адкрыта музычная школа. У 1982 г. у сасновым парку быў пабудаваны помнік воінам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Са старажытных славутасцяў у Барані можна ўбачыць будынак прытулку 1905 г., у якім утрымоўваліся састарэлыя, нямоглыя, інваліды, калекі. Таксама некалі ў пасёлку размяшчалася царква Праабражэння Гасподняга пачатку XVIII стагоддзя, якая ў 1989 г. была перавезена ў Беларускі музей народнай архітэктуры і побыту ў Азярцы і там адноўлена. Узамен вывезенага быў пабудаваны новы Храм Праабражэння Гасподняга з не менш цікавай архітэктурай.

У кастрычніку 2003 г. Геральдычным Саветам пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь былі зацверджаны герб і сцяг горада Барані: у блакітным полі «іспанскага» шчыта злучаныя паўперавязі залатога колеру, у цэнтры – паляўнічы ражок, зверху – сярэбраны кавалерскі крыж. У гісторыка-геральдычным абгрунтаванні даецца наступная расшыфроўка фігур дадзенага герба: геральдычная фігура – залатыя перавязі – ганаровая фігура, якая сімвалізуе дарогі, на скрыжаванні якіх узнік горад, і яго геаграфічнае становішча.

Кавалерскі крыж сімвалізуе веру, незалежнасць, доблесць і адвагу, заслугі продкаў на ратным полі. Паляўнічы ражок указвае на старажытнасць горада і сувязь з яго заснавальнікам князямі Радзівіламі. Сцяг быў спраектаваны з выкарыстаннем асноўных колераў герба і гербавага малюнка.

Сёння былы працоўны пасёлак – гэта сучасны горад, цэнтр тэхнічнай інтэлігенцыі. У горадзе ёсць тры агульнаадукацыйныя школы, чатыры дзіцячыя садкі, школа мастацтваў, Палац культуры. На тэрыторыі размяшчаюцца гарадская бальніца і паліклініка. Каля старажытнага сасновага бора-парку, любімага месца адпачынку гараджан, на беразе ракі Адроў узвышаецца Храм Праабражэння Гасподняга, а непадалёк – помнікі танкістам і воінам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Непадалёк ад ААТ «Тэхніка сувязі» знаходзіцца Цэнтр бяспекі МНС, які дзякуючы інавацыйным тэхналогіям дазваляе акунуцца ў свет бяспекі, а таксама азнаёміцца і аднавіць веды. На ўездзе ў г. Барань знаходзіцца Цэнтр алімпійскага рэзерву па конным спорце і конегадоўлі.

Гісторыя г. Барані шматгранная, у ёй было шмат як трагічных, так і гераічных старонак, але яго жыхарам ёсці чым ганарыцца. Страта духоўна-маральных каштоўнасцяў, назапашаных стагоддзям з'яўляецца адной з найбольш важных праблем сучаснага грамадства. Кожны чалавек, незалежна ад узросту, павінен памятаць і, галоўнае усведамляць, што без мінулага няма сучаснага і будучыні.

**Л. НІКУЛІНА**
**вядучы архівіст**
**аддзела выкарыстання**
**дакументаў установы**
**«Занальны дзяржаўні**
**архіў у г. Оршы**